**Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні прыметніка на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе**

1. **Агульныя заўвагі**

З пачатковай школы дзеці ведаюць азначэнне прыметніка, яго асноўныя марфалагічныя прыметы, адзначаюць залежнасць роду, ліку, склону прыметніка ад роду, ліку, склону назоўніка. Дэталёвае вывучэнне прыметніка ў сярэдняй школе пачынаецца з шостага класа. Па праграме на беларускую мову ў 6-м класе адводзіцца 105 гадзін: 3 гадзіны ў тыдзень, з іх 17 – на пісьмовыя працы. На вывучэнне тэмы “Прыметнік” адводзіцца 19 гадзін, з іх 2 – на пісьмовыя працы (кантрольны пісьмовы пераказ мастацкіх тэкстаў з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання).

Пры вывучэнні прыметніка вучні знаёмяцца з паняццем “прыметнік” (агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля, пачатковая форма). У кантэксце тэмы “Прыметнік” паглыбляецца паняцце пра апісанне (апісанне прымет рэчаў, з’яў, людзей, жывёл, ландшафтаў, мясцовасці, памяшканняў).

Трэба мець на ўвазе, што, паколькі прыметнік граматычна залежыць ад назоўніка і дапасуецца да яго ў родзе, ліку, склоне, яго семантыка і граматычныя асаблівасці тлумачацца на сінтаксічнай аснове, шляхам аналізу сэнсавых і граматычных сувязей паміж прыметнікам і тым назоўнікам, да якоаг ён адносіцца ў складзе словазлучэння. Таму праца над удасканаленнем і асэнсаваннем сувязі прыметніка з назоўнікам павінна стаць неад’емнай часткай вывучэння тэмы “Прыметнік”.

Вывучаюцца якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні. Разглядаюцца ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне; поўная і кароткая формы. Аналізуецца скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Адбываецца знаёмства з асноўнымі спосабамі ўтварэння прыметнікаў. Разглядаюцца прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання і правапіс. Вывучаюцца прыметнікі з суфіксам -ск-, іх правапіс. Вывучаецца правапіс **н**, **нн** у прыметніках; правапіс **не (ня)** з прыметнікамі. Аналізуюцца ўтварэнне і правапіс складаных прыметнікаў.

Пасля вывучэння тэмы “Прыметнік”, па патрабаваннях праграмы, вучні павінны ўмець:

- чытаць тэксты розных стыляў, знаходзіць прыметнікі і апорныя словазлучэнні ў тэксце;
- утвараць і правільна ўжываць формы ступеняў параўнання;
- правільна ўжываць прыметнікі ў колькасна-іменных словазлучэннях з лічэбнікамі **два, тры, чатыры**, у спалучэннях з назоўнікамі, што абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу, у спалучэннях з назоўнікамі агульнага роду, у спалучэннях са складанаскарочанымі назоўнікамі;
- рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У падручніку тэма “Прыметнік” падзелена на дванаццаць параграфаў. Кожны параграф разглядае асобны разрад і асобную марфалагічную прымету прыметніка. Акрамя таго, кожны параграф пачынаецца з адпаведанага правіла пра прыметнік і ўключае матэрыялы для паўтарэння, для завучвання, для азнаямлення. Таксама кожны параграф змяшчае разнастайныя заданні і практыкаванні на адпаведнае правіла (у тым ліку дадатковыя і павышанай цяжкасці), якія развіваюць уменні вучняў. Усе заданні і практыкаванні па тэме адпавядаюць патрабаванням праграмы. Маецца ў вучэбным дапаможніку і матэрыял, накіраваны на развіццё пазнавальных інтарэсаў вучняў. Гэта не толькі новыя правілы, але – што асабліва важна – тэксты і сказы практычных заданняў, якія ўтрымліваюць звесткі з прыродазнаўства, літаратуры, гісторыі і інш. і садзейнічаюць пазнанню новага. Развіццю творчых здольнасцей дзяцей садзейнічаюць сярод іншых тэкстаў заданні тыпу “Дакажыце”, “Растлумачце” і інш.

Такім чынам, праграма па беларускай мове прадугледжвае вывучэнне ўсіх аспектаў прыметніка ў 6 класе сярэдняй школе. У адпаведнасці з праграмай створаны і падручнік па беларускай мове, матэрыялы якога цалкам рэалізуюць усе функцыі вучэбнага выдання па тэме “Прыметнік”.

## 2. Сістэма практыкаванняў па вывучэнні прыметніка на ўроках беларускай мовы

Практыкаванні адыгрываюць істотную ролю ў вывучэнні роднай мовы. Яны садзейнічаюць шматразоваму і варыятыўнаму прымяненню атрыманых ведаў на практыцы з мэтай выпрацоўкі ўменняў і навыкаў. Без практыкаванняў школьнае навучанне будзе схаластычным.

Розныя віды практыкаванняў разлічаны на асэнсаванне лінгвістычнай сутнасці пэўных моўных з’яў, выяўленне канкрэтных адзінак у тэксце, авалоданне адпаведнымі формамі разважанняў і вывадаў пры аналізе і пры ўжыванні гэтых адзінак у моўнай практыцы, на ўсведамленне іх ролі ў вуснай і пісьмовай мове, выпрацоўку ўменняў і навыкаў правільнага карыстання набытымі ведамі. Адны практыкаванні разлічаны на калектыўнае выкананне з дапамогай настаўніка, другія – на самастойнае выкананне рэпрадуктыўнага характару, трэція – на калектыўнае, самастойнае ці напаўсамастойнае творчае выкананне. Акрамя таго, практыкаванні маюць розную ступень складанасці (у тым ліку павышанай цяжкасці), каб настаўнік меў магчымасць выбару, калі працуе з класам ці вучнямі з рознай лінгвістычнай падрыхтоўкай.

Выкарыстоўваюцца практыкаванні наступных тыпаў: аналітычныя (аналіз слоў, словазлучэнняў і інш.; класіфікацыя, параўнанне моўных адзінак па функцыі, будове і значэнні), аналітыка-сінтэтычныя (запіс слоў, сказаў, тэкстаў з заданнямі рознага тыпу), сінтэтычныя (канструяванне словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў).

На ўроках мовы практыкаванні займаюць 80% часу, таму надзвычай важна, каб яны былі мэтанаківаранымиі выкарыстоўваліся ў пэўнай сістэме. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Адносныя прыметнікі” прапануюцца

практыкаванні ў такой паслядоўнасці: матэрыял для назірання над значэннем і функцыяй моўных адзінак у кантэксце, вуснае скланенне прыметнікаў, запіс тэксту з ужываннем прыметнікаў у пэўнай граматычнай форме, утварэнне словазлучэнняў з прыметнікамі, стылістычная праўка тэксту (выпраўленне памылак, звязаных з утварэннем і правапісам прыметнікаў), пабудова ўласных тэкстаў.

Пазнавальныя ўменні вучняў пры вывучэнні прыметніка фарміруюцца з дапамогай наступных тыпаў практыкаванняў:

- *доказ прыналежнасці моўнай з'явы да пэўнага разраду, групы*. Гэта першасны тып практыкваання, сутнасць якога – у абгрунтаванні аднясення той ці іншай з'явы да пэўнай катэгорыі. Напрыклад, прапануецца знайсці прыметнік у кожным радзе і падкрэсліць яго:
    1. Чырвань, чырвоны, чырванець.
    2. Сіні, сінеча, сінее.
    3. Радавацца, радасць, радасны.
- *распазнаванне ў матэрыяле вывучаемай моўнай з'явы*. Пры выкананні такіх практыкаванняў не даецца ніякіх падказак ці арыенціраў. Напрыклад, прапануецца падкрэсліць толькі адносныя прыметнікі:

  Залаты пярсцёнак, бабровая шапка, мяккі пух, мядзведжы след, залаты гай, жалезны голас, алавяны стрыжань, птушыны нос, птушыная дзюба.
- *падбор прыкладаў для ілюстрацыі пэўнай моўнай з'явы.* Такое практыкаванне вымагае большай самастойнасці вучняў, ім давядзецца трымаць у памяці пэўныя прыметы і падбіраць адпаведныя моўныя факты з названых крыніц. Напрыклад, прапануецца прыгадаць назвы беларускіх зёлак, спалучыць іх з прыметнікамі, з трыма словазлучэннямі скласці сказы.

Пры вывучэнні назоўніка могуць быць прапанаваны для выканання і *класіфікацыйныя практыкаванні*. Напрыклад, прапануецца вызначыць, якая марфалагічная з'ява ляжыць у аснове падзелу слоў на дзве групы:

**мацнейшы, весялейшы, хутчэйшы, лепшы, горшы;**
**мацней, весялей, хутчэй, лепш, горш.**

Шырока выкарыстоўваецца пры вывучэнні прыметніка запаўненне гатовых табліц прыкладамі, а таксама складанне табліц і запаўненне іх прыкладамі (напрыклад, трэба ў адзін слупок выпісаць поўныя прыметнікі, у другі – кароткія з прапанаваных сказаў). Вялікая ўвага пры вывучэнні згаданай тэмы адводзіцца *аналітыка-сінтэтычным* практыкаванням, якія ўяўляюць сабой поўны або частковы граматычны (марфалагічны) разбор. *Граматычны разбор* – адзін з важнейшых прыёмаў, які выкарыстоўваецца на занятках па граматыцы. Ён дапамагае лепш асэнсаваць і зразумець вывучаемы матэрыял, больш выразна і дакладна ўявіць граматычную сістэму, яе асаблівасці на канкрэтных прыкладах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Састаўной часткай граматычнага разбору з'яўляецца *марфалагічны* - адзін з найважнейшых метадычных прыёмаў пры вывучэнні прыметніка. Схема такога разбору складаецца з наступных частак:

1. Назваць пачатковую форму прыметніка.
2. Адзначыць пастаянныя прыметы (якасны, адносны ці прыналежны).
3. Паказаць непастаянныя прыметы (лік, склон, род).
4. Вызначыць сінтаксічную функцыю ў сказе.

Значэнне марфалагічнага разбору заключаецца ў тым, што ён:

- дапамагае вучням свядома і трывала засвоіць тэарэтычныя звесткі;
- служыць сродкам замацавання, паўтарэння, сістэматызацыі і парверкі ведаў;
- фарміруе ўменне назіраць, аналізаваць і дыферэнцыраваць моўныя з'явы, устанаўліваць у іх агульнае і прыватнае;
- з'яўляецца сродкам развіцця абстрактнага мыслення, выпрацоўкі навыкаў лагічнага доказу.

Марфалагічны разбор можа быць вусным і пісьмовым (паводле формы), поўным і частковым (паводле аб'ёму).

Істотнае значэнне мае парадак марфалагічнага разбору (як вуснага, так і пісьмовага) прыметніка, які падаецца ў асобным параграфе вучэбнага дапаможніка. У практ. 255 патрабуецца яго зрабіць, выбраўшы прыметнікі з прапанаваных трох сказаў і карыстаючыся парадкам і ўзорамі разбору:

**1.Той, хто ранняю вясной зямлю і песціць, і арэ, як дар, у прыгаршчы бярэ, - ніколі ў свеце не памрэ, бо сейбіт ён (Р.Тамола). 2. Я ні ў людзях, ні ў жыцці не зняверыўся, людскую ласку берагу (П.Панчанка). 3. Залатая замець з хвіліну трымаецца ў паветры, круціць, нібы ў нябачным віры, затыя асядае на верасовы дол (І.Навуменка).**

Акрамя таго, у падручніку па тэме "Прыметнік" часта прапануюцца *камунікатыўныя практыкаванні*, якія ўключаюць заданні па раней вывучаным матэрыяле (напрыклад, па арфаэпіі і арфаграфіі – практ.199, умова якога: прачытаць тэкст, захоўваючы арфаэпічныя нормы беларускай мовы. Спісаць, паставіўшы прыметнікі ў патрэбным склоне); практыкаванні на складанне слозлучэнняў, сказаў, звязнага тэксту (напрыклад, практ.217 патрабуе запісаць прыметнікі, якія вызначаюць станоўчыя якасці характару чалавека. З двума прыметнікамі скласці і запісаць сказы), на пераклад спалучэнняў "прыметнік + назоўнік" з рускай мовы на беларускую (практ.231).

Варта спыніцца і на спецыфіцы падбору практыкаванняў пры вывучэнні розных паракграфаў тэмы. Так, каб вучні лепш засвоілі спецыфіку прыметніка як часціны мовы, прапануецца выканаць некаолькі практыкаванняў, у аснове якіх – аналіз словазлучэнняў "прыметнік+назоўнік" і выяўленне семантычных груп прыметнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(напрыклад: размеркаваць словазлучэнні на групы з улікам лексіка-граматычнага значэння прыметніка:

**Зялёная таполя, малады сад, шэры шынель, круглае сонца, старая хустка, прамы шрыфт, чулы сябар** і інш.**).**

Пры вывучэнні разрадаў прыметнікаў варта адразу звярнуць увагу на спецыфічныя асаблівасці якасных прыметнікаў: здольнасць уступаць у сінанімічныя і антанімічныя адносіны (можна прапанаваць вучням падабраць антонімы да слоў **блізкі, высокі, гарачы, лёгкі, салодкі, спакойны,** спалучыўшы іх з назоўнікамі; указаць прамое і пераноснае значэнні слоў у словазлучэннях **цёплы дзень – цёплая сустрэча, доўгае паліто – доўгі язык, светлыя валасы – светлая галава**). Вялікую ролю тут адыгрываюць і практыкаванні на ўтварэнне магчымых форм вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання якасных прыметнікаў, знаходжанне і выпраўленне дапушчаных у тэксце памылак на іх ужыванне, на пераклад словазлучэнняў з рускай мовы на беларускую.

Пры разглядзе адносных прыметнікаў можна прапанаваць заданне на ўтварэнне ад назоўнікаў тыпу **сталь, авёс, дрэва, яблык, Мінск** адносных прыметнікаў (узор: сталь – сталёвы нож), тут жа пракаменціраваць правапіс суфікса –ск- (-цк-) у адносных прыметніках.

Для засваення сістэмы скланення і правапісу прыналежных прыметнікаў вучням прапануецца прааналізаваць табліцу склонавых форм такіх прыметнікаў і ўтварыць ад прапанаваных назоўнікаў пырналежныя прыметнікі.

Вучні дапускаюць шмат памылак у вычляненні словазлучэнняў “прыметнік + назоўнік”, калі прыметнік стаіць у дыстантнай пазіцыі, аддзелены ад назоўніка адным ці некалькімі словамі. Таму патрэбны спецыяльныя практыкаванні для выпрацоўкі ўмення вылучаць словазлучэнні з больш складаных сінтаксічных канструкцый.

Адначасова з працай над словазлучэннем, у склад якога ўваходзіць прыметнік, разглядаецца і сінтаксічная роля прыметніка ў сказе. З гэтай мэтай праводзіцца аналіз сказаў з падручніка або запісаных на дошцы. Тут жа варта спыніць увагу і на кароткіх формах прыметнікаў, якія ў сказе выступаюць толькі як выказнікі і маюць спецыфічныя канчаткі.

У час вывучэння прыметніка патрабуе разгляду пытанне аб прыметніку ў складзе тэрміналагічнай назвы з уласна-намінатыўным значэннем *(Мінская вобласць, Вялікае княства Літоўскае* і інш). Для гэтага можна прапанаваць вучням успомніць і назваць такія словазлучэнні, а затым запісаць некалькі сказаў з імі.

Адно і тое ж практыкаванне можа мець мноства варыянтаў (мадыфікацый). Настаўнік у залежнасці ад падрыхтоўкі класа, іншых умоў можа ўдакладняць (змяняць – пашыраць, скарачаць) метадычны апарат практыкавання, яго аб’ём (умова практыкавання і постзаданні могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выконвацца поўнасцю ці часткова). Аднак такія змены павінны быць заўсёды матываванымі і метадычна абгрунтаванымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ